Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
фота аўтара

# Ідэі набылі форму

**Штогод Міністэрства культуры Беларусі ладзіць конкурс па вылучэнні стыпендый для творцаў. Дзякуючы дзяржаўнай фінансавай падтрымцы стыпендыяты на працягу года ўвасабляюць задуманыя праекты і паводле вынікаў сваёй працы пішуць справаздачы. Аднак чарговыя стыпендыяты Міністэрства культуры ў галіне выяўленчага мастацтва вырашылі парушыць штогадовую завядзёнку і сёлета ўпершыню, апроч традыцыйных індывідуальных афіцыйных справаздач з прыкладаннем фотаілюстрацый, падрыхтавалі выніковую калектыўную выстаўку.**

Рэспубліканская мастацкая выстаўка работ стыпендыятаў Міністэрства культуры Беларусі разгарнулася ў сталічнай галерэі "Універсітэт культуры" і прабудзе тут да 19 лютага. Яе арганізатарамі сталі само міністэрства, БДУ культуры і мастацтваў, Беларускі саюз мастакоў, а куратарам — знаны жывапісец Уладзімір Кожух, якому і належала ідэя такой экспазіцыі.

Падчас выступлення на вернісажы, які прыцягнуў увагу многіх адметных творчых асоб і артмоладзі, галоўны спецыяліст упраўлення мастацтваў МК Беларусі Аляксандр Зіменка зазначыў: "Зерне, што было пасеяна год таму, дало выдатны плён, і дзякуючы такой выстаўцы можна бачыць, як ідэя набыла форму". Прарэктар БДУКіМ па навуковай працы Марына Мажэйка, падкрэсліўшы, што кожная са шматлікіх выставак, якія адбываюцца ў гэтай галерэі, мае сваю "разыначку", вызначыла асаблівасць цяперашняй экспазіцыі: "Мастакі-стыпендыяты рыхтавалі свае праекты цэлы год. Іх творы — артэфакты, ад якіх зыходзяць мастацкія імпульсы, а гэта дарагога каштуе". Мастацтвазнаўца Яўген Шунейка выказаў шчырую задаволенасць тым, што Міністэрства культуры фінансуе праекты мастакоў, бо такім чынам яно падтрымлівае права творцаў на самавыказванне, самавыяўленне: "Для творчых асоб мастацкае жыццё — востраў свабоды, але не так і лёгка, не так і вольна лётаць у творчых марах, калі няма дзяржаўнай падтрымкі. Тут — атрымалася! Таму ў новым дзесяцігоддзі нашы мастакі павінны развіваць дасягнутае, працаваць максімальна адказна і ярка, перадаючы ў сваёй творчасці беларускія ідэі ды надзеі".

У залах галерэі экспануюцца творы жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, скульптуры, дызайну, якія, можна сказаць, увасабляюць захапляльныя старонкі творчых біяграфій сваіх аўтараў. Карціны з вядомага нашым чытачам цыкла "Белы вальс" прадставіла магілёўчанка Галіна Конанава. Адмысловы дызайн узнагарод бацькі-франтавіка і свет старых побытавых рэчаў, а яшчэ — містычнае хараство беларускіх азёраў сталіся крыніцай натхнення Таццяны Малышавай, якая з дапамогай таленавітых выканаўцаў, майстроў шклозавода "Нёман", стварыла свае далікатныя кампазіцыі. Серыю стыльных плакатаў, у тым ліку прысвечаных беларускай гістарычнай спадчыне, зрабіў дызайнер Сяргей Саркісаў. Гледачы маюць магчымасць падзівіцца на казачныя фантазіі ў бронзе, увасобленыя скульптарам Сяргеем Аганавым, атрымаць асалоду ад эстэтызаванай сімволікі карцін Сяргея Давідовіча, Юрыя Хілько, узняць настрой ля пейзажаў ды нацюрмортаў Лізаветы Аўчыннікавай, угледзецца ў панараму ўмоўнага горада, размешчанага на сяміметровым палатне Аляксея Іванова. І надоўга затрымацца ў асяроддзі беларускіх ветракоў ды вадзяных млыноў, увасобленых у тэматычнай серыі карцін Віктара Нямцова...



***На здымку: кампазіцыя Таццяны Малышавай (мастацкае шкло).***